«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Гомель: Трэці за гэты год штраф Ларысе Шчыраковай

10.04.2015 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова
Крыніца: Прэс-служба БАЖ



Ларыса Шчыракова (фота baj.by)

Суд Рэчыцкага раёна (суддзя Святлана Пырх) прызнала гомельскую фрыланс-журналістку, сябру ГА “БАЖ” Ларысу Шчыракову вінаватай у “незаконным вырабе і распаўсюдзе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі” і на падставе часткі 2 артыкула 22.9 КаАП пастанавіла аштрафаваць яе на 25 базавых велічыняў (4,5 мільёна рублёў).

Паводле пастановы суда, 6 лютага ў Рэчыцы на рынку “Славянскі” Шчыракова, “не з’яўляючыся журналістам сродку масавай інфармацыі, не маючы на тое права, правяла інтэрв’юіраванне грамадзян, падрыхтавала відэасюжэт пад назвай “Адміністрацыя рынку ў Рэчыцы рабуе гандляроў”, які ў той жа дзень размясціла на сайце тэлеканала “Белсат”, тым самым ажыццявіла незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі”.

Такое ж “парушэнне”, паводле судовай пастановы, Ларыса Шчыракова ўчыніла і 12 лютага, падрыхтаваўшы відэасюжэт “Нялюдскія ўмовы на Рэчыцкім рынку” – і таксама нібыта размясціла на сайце тэлеканала “Белсат”.

Справу разглядалі яшчэ ў канцы сакавіка і без удзелу журналісткі – яна была за межамі Беларусі і пакідала суду адпаведную заяву.

“Выглядае, што суддзі жывуць у нейкім віртуальным свеце, думаючы, што журналіст пры дапамозе чароўнай палачкі размяшчае ўсё і ўсюды, што толькі і дзе захоча – на “Белсаце”, CNN, у Washington Post. Як я магу дзе што-небудзь размясціць, калі я нават не маю доступу да таго ж сайту “Белсата”? Я як грамадзянка і фрылансер маю права збіраць і распаўсюджваць інфармацыю – па Канстытуцыі. А мне суд прыпісвае функцыі юрыдычнай асобы, у дадзеным выпадку тэлеканала “Белсат”, які сапраўды вырабляе прадукцыю СМІ і распаўсюджвае яе”, – каментуе штраф службе маніторынгу ГА “ БАЖ” Ларыса Шчыракова.

“Дапамагаюць зачышчаць медыйнае поля перад прэзыдэнцкімі выбарамі, – лічыць яна. – Эканоміка краіны “прасела”, сацыяльны кантракт не выконваецца, таму і б’юць рублём, прымушаюць маўчаць”.

Гэта сёлета ўжо трэцяе пакаранне Ларысе Шчыраковай. У студзені яна здымала пікет адзіночкі-інваліда ў Светлагорску, пасля чаго яе абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве і пакаралі штрафам. 12 сакавіка суддзя Цэнтральнага суда Гомеля **Віктар Казачок** аштрафаваў Шчыракову на 20 базавых велічыняў – за выраб без акрэдытацыі Міністэрства замежных спраў “прадукцыі СМІ” для тэлеканалу “Белсат”.

Агулам сума штрафаў журналістцы склала 8 мільёнаў рублёў.

Опубликовать







Паказваў "Вікторыю" на Маршы. Мужчыну асудзілі да 2,5 гадоў "хатняй хіміі" па "народным" артыкуле

Двух сябровак асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Мужа і жонку Каражан асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у акцыі пратэсту

У рэгіёнах Міншчыны праводзяць пікеты ў "падтрымку выбараў". Разбіраемся, што з імі не так

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"У мяне не было магчымасці супраціўляцца інакш". Маналогі затрыманых на антываенных акцыях два гады таму

"Турмы ў турме": захаванне правоў зняволеных ў ізалятарах, карцарах і ПКТ — праблемы і выклікі

"У ПК-1 палітвязняў прымушаюць закапваць будаўнічае смецце і спальваць адкіды". Былы вязень указаў месцы на мапе

Запрашаем на канферэнцыю! Штрафны ізалятар, карцар, ПКТ: інструмент выпраўлення ці знявагі?









АПОШНІЯ НАВІНЫ

Больш за 8000 жанчын зазналі палітычны пераслед у Беларусі. Рэпрэсіі ў адносінах да жанчын — у інфаграфіках

Дайджэст вызваленых: мінімум 24 палітвязні ў лютым выйшлі на волю па заканчэнні тэрміну

Палітвязню Алегу Рубцу прызначылі яшчэ паўтара года зняволення

Былая палітзняволеная Алена Дзядзюля: "Я абяцала жанчынам, што буду распавядаць пра іх лёсы паўсюль, дзе магу"

Арышт за "Жыве Беларусь" і забойства расійскімі сілавікамі беларускага актывіста: хроніка пераследу 6-7 сакавіка (дапоўнена)

За Марш асудзілі мужа і жонку: іх затрымалі, калі яны выязджалі з Беларусі ў госці да дзяцей

У лютым судзілі ў крымінальным парадку мінімум 129 чалавек

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Люты 2024

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Выбары*2024

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

АДС memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

european platform for democratic elections
epde

VOICE OF BELARUS

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

#BYSOL

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS